РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
28 ЧЭРВЕНЯ 2025 г. СУБОТА № 124 (30512)

# КАНСТРУКТЫЎНЫ ДЫЯЛОГ АДНАДУМЦАЎ



Фота БелТА.

«Трэба ставіць новыя задачы і разам іх дасягаць» — такі пасыл для будучага развіцця ЕАЭС агучыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, выступаючы на пленарнай сесіі Еўразійскага эканамічнага форуму. На гэтым засяродзіліся ўдзельнікі пасяджэння Вышэйшага эканамічнага савета. У Палац Незалежнасці прыехалі лідары дзяржаў — членаў ЕАЭС, краін-назіральніц і кіраўнікі замежных дэлегацый.

Гэта першае пасяджэнне Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета ў 2025 годзе, і праграма яго насычаная. На парадак дня саміту было вынесена каля паўтара дзясятка пытанняў. Яны тычацца розных сфер: міжнароднай дзейнасці, стратэгічных кірункаў еўразійскай эканамічнай інтэграцыі, лібералізацыі паслуг у ЕАЭС, эканамічнага супрацоўніцтва ў галіне спорту і іншых.

ЕАЭС — не пляцоўка для пустых размоў, а моцнае інтэграцыйнае аб'яднанне, якое за 10 гадоў прайшло вялікі шлях. Разам з тым, як адзначаў напярэдадні саміту Аляксандр Лукашэнка, ёсць і нямала праблем, выкананы не ўсе паказчыкі. Таму лідары ўдзялілі ўвагу не толькі дасягненням, але і пытанням, вырашэнне якіх зробіць саюз яшчэ мацнейшым.

СТАР. 2–5



ГАРАНТЫІ МАЛАДЫМ СПЕЦЫЯЛІСТАМ 7




ПОПЫТ НА РЭДКАЗЯМЕЛЬНЫЯ МЕТАЛЫ РАСЦЕ 11



КОЛЬКІ ГАДОЎ ЖЫВЕ САПРАЎДНАЕ КАХАННЕ? 12



ЧЫТАЮЧЫ КНІГІ, РОБІМ АДКРЫЦЦІ 16

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X
25124
9 771990 763008

# «ТЭМП РАЗВІЦЦЯ НАШАГА САЮЗА НА НАСТУПНУЮ ПЯЦІГОДКУ ПАВІНЕН БЫЦЬ НАПРУЖАНЫМ»

## Што абмяркоўвалі лідары ў вузкім складзе

Пасяджэнне Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета спачатку прайшло ў вузкім складзе — з удзелам кіраўнікоў дзяржаў — членаў ЕАЭС. Сваіх калег беларускі лідар сустрэў у Палацы Незалежнасці асабіста, і пасля традыцыйнага агульнага фота прэзідэнты пачалі актыўную работу.



Фота БелТА.

### «МЫ ЗАХОЎВАЕМ РЭГУЛЯРНАСЦЬ СУСТРЭЧ НА САМЫМ ВЫСОКІМ УЗРОЎНІ»

«Вы заўсёды адзначалі, што ў Мінску ў нас атрымліваецца, праводзячы тыя ці іншыя мерапрыемствы, скончыць іх выніковa», — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да прысутных кіраўнікоў дзяржаў і выказаў упэўненасць, што і гэты саміт не стане выключэннем.

«Я вельмі рады вітаць вас у беларускай сталіцы. Нягледзячы на загружанасць графікаў прэзідэнтаў, мы захоўваем рэгулярнасць сустрэч на самым высокім узроўні», — падкрэсліў беларускі лідар. Такая рэгулярнасць, несумненна, дазваляе аператыўна рэагаваць на праблемы, якія ўзнікаюць, вырашаць пытанні, па якіх не можа знайсці развязкі Еўразійская эканамічная камісія, ды і ў цэлым падтрымліваць інтэнсіўны тэмп работы органаў ЕАЭС.

«Думаю, вы пагодзіцеся, што дадзеныя сустрэчы таксама добрая магчымасць у коле блізкіх па духу людзей абмеркаваць міжнародны парадак дня. А ён вельмі насычаны апошнім часам», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. У рамках пленарнай сесіі Еўразійскага эканамічнага форуму лідары пачалі абмеркаванне актуальных тэм і стратэгіі паглыблення еўразійскай інтэграцыі. Прэзідэнт заўважыў, што адбыўся прадметны абмен думкамі аб перспектывах эканамічнага партнёрства, кожны выказаў свае ацэнкі і бачанне далейшага развіцця Саюза.

**«Упэўнены, што рэалізацыя агучаных ідэй будзе садзейнічаць умацаванню ЕАЭС як ключавой інтэграцыйнай платформы на постсавецкай прасторы і полюса эканамічнага прыцягнення ў міжнародным вымярэнні, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Наша аб'яднанне прыцягвае да сябе ўвагу ў свеце. Адны па-добраму глядзяць, як мы нядрэнна набіраем абароты, і падключаюцца да нашага Саюза. Другія прадчуваюць момант, калі мы спатыкнёмся ці ўвогуле разыдземся. Чые чаканні апраўдаюцца, залежыць выключна ад нас».**

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, членам Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета ёсць што абмеркаваць. Шэраг пытанняў парадку дня патрабуе прыняцця канкрэтных рашэнняў на самым высокім узроўні.

«Старшынства Рэспублікі Беларусь у органах ЕАЭС рэалізоўваецца ў асаблівы год з пункту гледжання далейшых перспектыў для развіцця нашага аб'яднання», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка і патлумачыў, чаму.

**Па-першае, завяршаецца рэалізацыя стратэгічных кірункаў развіцця еўразійскай эканамічнай інтэграцыі да 2025 года. «Гэта значыць, прыняўшы праграму да 2025 года, мы яе сёлета завяршаем. З усімі недахопамі, пра якія мы гаварылі», — удакладніў беларускі лідар. Па-другое, сёлета павінна быць прынятая «дарожная карта» сумесных дзеянняў на наступны перыяд — ужо для рэалізацыі Дэкларацыі аб далейшым развіцці эканамічных працэсаў у ЕАЭС.**

«Мы падтрымалі прапанову аб тым, што адпаведны план мерапрыемстваў будзе зацверджаны на ўзроўні Савета ЕЭК, а затым прадстаўлены Вышэйшаму савету, — нагадаў Прэзідэнт. — Але гэта не значыць, што пытанне застанецца без увагі кіраўнікоў дзяржаў. Чакаем грунтоўны даклад на снежаньскім пасяджэнні».

Звяртаючыся да калег, Аляксандр Лукашэнка заявіў:

**«Калі мы хочам, каб ЕАЭС быў рабочай і эфектыўнай структурай, а не пляцоўкай тэарэтычных дыскусій (хоць гэта таксама нядрэнна), тэмп развіцця нашага саюза на наступную пяцігодку павінен быць напружаным, па кожным кірунку патрэбны выразны алгарытм дзеянняў, якія прыводзіць да пэўнага агульнага выніку».**

### РУХ У МІЖНАРОДНЫМ НАПРАМКУ ІДЗЕ ПРАВІЛЬНЫМ КУРСАМ

Прэзідэнт заўважыў, што добрай традыцыяй становіцца прысутнасць на парадку дня тэматыкі міжнароднага супрацоўніцтва. У парадак пасяджэння Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета ўключаны даклад аб рэалізацыі Асноўных напрамкаў міжнароднай дзейнасці Саюза за 2024 год.

«Лічу, што рух у гэтым пытанні ідзе правільным курсам, асабліва ў цяперашняй міжнароднай абстаноўцы, калі разбураюцца, здавалася б, непарушныя правілы і дамоўленасці, якія захоўваліся дзесяцігоддзямі», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка заявіў аб неабходнасці прадоўжыць сістэмную работу па спалучэнні патэнцыялу ЕАЭС з магчымасцямі найбуйнейшых міжнародных аб'яднанняў і ініцыятыў, з якімі агульныя статутныя каштоўнасці. «Найважнейшы інструмент прасоўвання агульных інтарэсаў дзяржаў-членаў на міжнароднай арэне — стварэнне зон свабоднага гандлю Саюза з трэцімі краінамі», — адзначыў ён.

На парадку дня пасяджэння Вышэйшага савета — таксама і падпісанне часовага гандлёвага пагаднення з Манголіяй і пагаднення аб эканамічным партнёрстве з Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі.

**«Пашырэнне пула краін, якія заключылі з намі падобныя дагаворы, пацвярджае правільнасць міжнароднага вектара дзейнасці саюза», — упэўнены кіраўнік дзяржавы.**

### ТРЭБА ПАГАВАРЫЦЬ ПРАДМЕТНА

Традыцыйна на парадку дня прысутнічаюць пытанні функцыянавання ўнутранага рынку ЕАЭС. «Тут таксама трэба будзе прадметна пагаварыць, даць ацэнку ўплыву асобных фактараў, прыняць рашэнні аб тым, як будзем рухацца далей», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Упэўнены, што нашы зносіны як у рамках афіцыйнага парадку дня, так і за яго межамі дазволяць знайсці адказы на ўсе існуючыя пытанні, у коле аднадумцаў падабраць ключы да вырашэння самых складаных інтэграцыйных задач», — рэзюмаваў беларускі лідар.

# «СТВАРАЦЬ УМОВЫ ДЛЯ МІРНАГА І СПАКОЙНАГА ЖЫЦЦЯ НАШЫХ НАРОДАЎ»

## На пасяджэнні ў пашыраным складзе Аляксандр Лукашэнка расставіў акцэнты далейшага развіцця ЕАЭС

Больш прадметна пра задачы і перспектывы дадзенага аб'яднання гаварылі на пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета ў пашыраным складзе. Да кіраўнікоў дзяржаў — членаў ЕАЭС далучыліся лідары Кубы і Узбекістана, якія маюць статус дзяржаў — назіральнікаў пры ЕАЭС. У мерапрыемстве прынялі ўдзел таксама Наследны прынц Абу-Дабі, першы намеснік Прэм'ер-міністра Манголіі. Па відэаканферэнцсувязі з удзельнікамі пасяджэння Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета ў пашыраным складзе звязаўся Прэзідэнт Ірана (краіна ўпершыню прыняла ўдзел у мерапрыемстве Савета ў статусе паўнавартаснага назіральніка).

### «ЕАЭС ЗДОЛЬНЫ СТАЦЬ ЯДРОМ КАНКУРЭНТАЗДОЛЬНАЙ І ПАСПЯХОВАЙ ПРАСТОРЫ «ІНТЭГРАЦЫІ ІНТЭГРАЦЫЙ»

Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз прывітаў усіх удзельнікаў і гасцей саміту на мірнай беларускай зямлі. Пры гэтым падкрэсліў, што магчымасць адкрыта і, галоўнае, у сяброўскай, спакойнай абстаноўцы абмяркоўваць любыя, нават самыя складаныя праблемы з'яўляецца сапраўднай раскошай у сучасным свеце. У Беларусі такая магчымасць, па яго словах, беражліва захоўваецца.

«Геапалітычная напружанасць, якая расце, і фрагментацыя сусветнай эканомікі дысануюць з запытам глабальнай большасці», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

**— Мы павінны ўсё-ткі імкнуцца адкінуць убок дэструктыўны парадак, які навязвае так званы «залаты мільярд» (хоць ужо ён ніякі не залаты). Трэба павышаць канкурэнтаздольнасць эканомік, развіваць прамысловасць, дабівацца тэхналагічнага суверэнітэту, забяспечваць харчовую бяспеку, ствараць умовы для мірнага і спакойнага жыцця нашых народаў.**

Беларускі лідар падкрэсліў, што Саюз паспяхова прайшоў этап станаўлення і дэманструе добрыя тэмпы развіцця. Ён праінфармаваў, што ў 2024 годзе ВУП аб'яднання вырас амаль на 4,5 %, перавысіўшы 2,5 трлн долараў, рост прамысловасці склаў 4,5 %, інвестыцый у асноўны капітал — 7,5 %. «Пагадзіцеся, годны вынік, — звярнуў увагу Прэзідэнт. — Дай бог на гэтым узроўні ўтрымацца».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ЕАЭС здольны стаць ядром канкурэнтаздольнай і паспяховай прасторы «інтэграцыі інтэграцый», на якой еўразійскі эканамічны патэнцыял быў бы спалучаны з велізарнымі магчымасцямі ШАС, БРІКС, АСЕАН і іншых аб'яднанняў Глабальных Поўдня і Усходу.

**«У перыяд нашага старшынёўства, як і заўсёды, Беларусь будзе прымаць усе неабходныя меры для ўзмацнення эканамічнага патэнцыялу ЕАЭС, умацавання яго міжнароднага аўтарытэту, — запэўніў кіраўнік дзяржавы. — Зыходзім з таго, што механізмы паглыбленага супрацоўніцтва Саюза з дзяржавамі-назіральнікамі будуць планамерна развівацца і дазволяць маштабіраваць еўразійскія праекты на больш шырокі інтэграцыйны контур».**

«Разглядаем як трывалую аснову эфектыўнага эканамічнага супрацоўніцтва з дружалюбнымі краінамі інстытут свабоднага гандлю. Задаволены ўступленнем у сілу ў бягучым годзе поўнамаштабнага пагаднення ЕАЭС аб свабодным гандлі з Іранам і настроены на яго актыўную рэалізацыю». Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што Прэзідэнт Ірана павінен быў прысутнічаць на саміце (упершыню ў якасці прадстаўніка дзяржавы — назіральніка пры ЕАЭС), аднак з прычыны вядомых абставін не змог.

«Нядаўнія ўдары па ядзерных аб'ектах Ірана, якія знаходзяцца пад кантролем МАГАТЭ, самым небяспечным чынам парушаюць палажэнні міжнароднага права, уключаючы Дагавор аб нераспаўсюджанні ядзернай зброі і Жэнеўскія канвенцыі 1949 года, — акцэнтаваў увагу беларускі лідар. — Не буду нават казаць аб пачуццях, якія такія дзеянні выклікаюць у Беларусі, — краіне, якая найбольш пацярпела ад аварыі на Чарнобыльскай атамнай станцыі. Тады радыеактыўныя ападкі былі зафіксаваны нават у Вялікабрытаніі, Германіі і Швецыі. Думаю, напэўна, што цяпер не накрые. Асабліва краіну, якая здзейсніла падобныя дзеянні».

### «СВАЕ ЎНУТРАНЫЯ РЫНКІ ДЗЯРЖАВЫ — ЧЛЕНЫ ЕАЭС ПАВІННЫ АБАРАНЯЦЬ»

«Вітаем падпісанне ў рамках бягучага саміту гандлёвых пагадненняў з Манголіяй і Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі, — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы. — З улікам двухбаковых і асабістых адносін мне прыемна, што падпісанне дакументаў адбудзецца менавіта ў Мінску. Сукупны ВУП краін і рэгіянальных інтэграцыйных аб'яднанняў, з якімі ў нашага Саюза ўстаноўлены і фармалізаваны адносіны, складае 72 трлн долараў. Гэта палова сусветнай эканомікі і палова насельніцтва ўсёй планеты — больш за 4 млрд чалавек. Уявіце, які патэнцыял, калі мы правільна ім распарадзімся. Вынік добры. Міжнароднае пазіцыянаванне ЕАЭС павінна заставацца прыярытэтным напрамкам намаганняў. Аб гэтым мы дамовіліся, абмяркоўваючы праблемы ў вузкім складзе».

**Аляксандр Лукашэнка спыніўся літаральна на некалькіх аспектах работы, якім, зыходзячы з вастрыні бягучага моманту, неабходна надаць асаблівую ўвагу.**

**• ПЕРШАЕ. ФУНКЦЫЯНАВАННЕ ЎНУТРАНАГА РЫНКУ ЕАЭС**

«Ва ўмовах тарыфнай вайны і перафарматавання міжнароднага гандлю неабходна ўважліва паглядзець, ці не скажаюцца ўмовы канкурэнцыі ў Саюзе для нашых вытворцаў з-за чужых тарыфных «эксперыментаў», — звярнуў увагу беларускі лідар. — Ці не падтрымліваем мы сваім рублём бізнес з трэціх краін ва ўрон нашым прадпрымальнікам і кампаніям? Чакаем ад Камісіі ацэнкі рызык для эканомік краін-членаў з прапановамі аб канкрэтных сумесных дзеяннях». Пры гэтым кіраўнік дзяржавы дадаў, што гэта пытанне становіцца ўсё больш актуальным. Ен падкрэсліў, што свае ўнутраныя рынкі дзяржавы — члены ЕАЭС павінны абараняць — так, як гэта робяць іншыя, — не грэбуючы ўласнымі інтарэсамі.

**• ДРУГОЕ. РАЗВІЦЦЁ ПРАМЫСЛОВАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ САЮЗА**

«Аб'ём унутранага рынку апрацоўчай прамысловасці ЕАЭС перавысіў 1 трлн долараў, — праінфармаваў Аляксандр Лукашэнка. — Лічба добрая, але што за ёй стаіць? У мінулым годзе мы запусцілі механізм падтрымкі прамысловай кааперацыі, выдзелілі сродкі, але, на жаль, пакуль няма вынікаў. У студзені, нарэшце, адобрана ажно два праекты на 17 млн долараў — выпуск стрэлак для чыгунак і кабін для камбайнаў. Ажно смешна называць гэтыя праекты».

Прэзідэнт перакананы, што патрэбны больш рашучыя крокі па стварэнні перадавых вытворчасцяў, асабліва ў сферах засілля заходніх карпарацый: фармацэўтыка, авія-, судна- і аўтамабілебудаванне, мікраэлектроніка.

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*



Фота БелТА.

# «СТВАРАЦЬ УМОВЫ ДЛЯ МІРНАГА І СПАКОЙНАГА ЖЫЦЦЯ НАШЫХ НАРОДАЎ»

**• ТРЭЦЯЕ (БЕЗ ЧАГО НЕ МОЖА ІСНАВАЦЬ НІ АДНА З ДЗЯРЖАЎ). ХАРЧОВАЯ БЯСПЕКА**

«У гэтым годзе ў нашых краінах вызначылася трывожная сітуацыя, калі для стабілізацыі цэн па асобных таварах даводзіцца прыадкрываць рынак ЕАЭС для імпарту, — сказаў беларускі лідар. — Для ўстаранення праблемы індыкатыўнага планавання недастаткова. Дарэчы, па тых таварах, якія мы з лішкам можам выраблять у сябе і прадаваць па ўсім свеце, Камісіі трэба падумаць над варыянтамі сістэмнага рашэння, каб не займацца мітуснёй і надзвычайшчынай, забяспечваючы людзей агароднінай, яблыкамі, маслам, цукрам, мясной прадукцыяй». Пры гэтым кіраўнік дзяржавы дадаў, што сёння масла столькі, што яго дзяваць няма куды.

***

Рэзюмуючы, Прэзідэнт адзначыў, што пералік задач ЕАЭС можна працягваць. «Патрэбны вынік у пытаннях лічбавага развіцця Саюза — той жа праслаўлены электронны подпіс павінен, нарэшце, запрацаваць, — паставіў задачу ён. — Трэба больш актыўна заняцца тэматыкай агульнай біржавой прасторы, паставіць кропкі над «і» ў асобных пытаннях у сферы тэхнічнага рэгулявання. Разам з тым такая дэталізацыя на ўзроўні лідараў краін не павінна падмяняць ініцыятыўную работу нашай эканамічнай камісіі».

Прэзідэнт заўважыў, што пра апошняе вельмі шмат казалі (аб эфектыўнасці Камісіі, штатным раскладзе, заработнай плаце членаў ЭЭК) і прынялі па азначаных пытаннях рашэнні. «У гэтым плане лакмусавай паперкай стане якасная падрыхтоўка Камісіяй «дарожнай карты» па рэалізацыі Дэкларацыі «Еўразійскі эканамічны шлях» (як мы называем ЕАЭС 2.0), — дадаў ён. — Таксама паказальным будзе годнае завяршэнне работы па Стратэгічных кірунках развіцця еўразійскай эканамічнай інтэграцыі да 2025 года. Асаблівая ўвага гэтаму была ўдзелена: мы вычленілі з трох сотень паўтара дзясятка пытанняў, якія мы абавязкова павінны да канца года рэалізаваць, вырашыць іх. Такое запэўненне з боку Камісіі мы атрымалі».

У завяршэнні Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што на пасяджэнні Вышэйшага савета ў канцы гэтага года разлічвае на грунтоўны даклад Старшыні Калегіі ЕЭК. «Беларусь мае намер прыкладаць усе намаганні для прасоўвання ідэй еўразійскай эканамічнай інтэграцыі», — падкрэсліў беларускі лідар. Ён яшчэ раз падзякаваў усім прысутным за тое, што яны прыехалі ў Беларусь. «Думаю, вы аб гэтым не шкадуеце,— заўважыў Прэзідэнт. — Любы прыезд, перагаворы (ці будзе гэта ў агульным складзе або на пляцоўках нашага Саюза, двухбаковыя кантакты) абавязкова прынясуць свой вынік».

У якасці прыкладу кіраўнік дзяржавы прывёў Рэспубліку Куба. Па яго словах, прысутнасць на пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета Прэзідэнта гэтай краіны, які не першы раз прымае ўдзел у гэтым мерапрыемстве, абавязкова прынясе кубінскаму народу свае плённыя вынікі. «Мы для гэтага будзем усё рабіць», — запэўніў беларускі лідар.

У прысутнасці кіраўнікоў дзяржаў быў падпісаны шэраг дакументаў. Сярод іх — Пагадненне аб эканамічным партнёрстве паміж ЕАЭС і яго дзяржавамі-членамі і Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі, Часовае гандлёвае пагадненне паміж ЕАЭС і яго дзяржавамі-членамі і Манголіяй.

***

Напрыканцы пасяджэння ў шырокім складзе Аляксандр Лукашэнка падзякаваў сваім калегам і кіраўнікам дэлегацый за плённую працу на палях саміту. Ён анансаваў, што ў снежні ў Санкт-Пецярбургу пройдзе традыцыйны нефармальны саміт ЕАЭС. «А ў 2026 годзе старшынства пераходзіць да нашых сяброў з Казахстана, і ў Астане мы правядзём наступны афіцыйны саміт ЕАЭС», — сказаў беларускі лідар.

*(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)*



Саміт быў у цэнтры ўвагі шматлікіх СМІ.

Фота БелТА.

# «ПАЗІЦЫІ ЕАЭС НА МІЖНАРОДНАЙ АРЭНЕ ЗНАЧНА ЎМАЦАВАЛІСЯ»

Прэзідэнт Беларусі даручыў Старшыні Калегіі Еўразійскай эканамічнай камісіі Бакытжану Сагінтаеву расказаць журналістам аб дамоўленасцях, дасягнутых падчас саміту.



«Разгледжаны шэраг важных пытанняў інтэграцыйнага парадку дня, — распавёў ён. — Гэта такія кірункі, як удасканаленне права ЕАЭС у рэалізацыі стратэгіі развіцця еўразійскай эканамічнай інтэграцыі, міжнароднае супрацоўніцтва, гандаль, развіццё рынку паслуг, рэгуляванне дзейнасці суб'ектаў натуральных манаполій, а таксама ўзаемадзеянне ў галіне спорту. Падпісаны два важныя міжнародныя дакументы: Пагадненне аб эканамічным партнёрстве паміж ЕАЭС і яго дзяржавамі-членамі і Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі, Часовае гандлёвае пагадненне паміж ЕАЭС і яго дзяржавамі-членамі і Манголіяй. Такім чынам, пашыраюцца межы супрацоўніцтва з трэцімі краінамі. Гэта работа праводзіцца на сістэмнай аснове».

Па словах Бакытжана Сагінтаева, імплементуюцца гандлёвыя адносіны з В'етнамам, Кітаем, Сербіяй, Іранам. «На фінальнай стадыі вядуцца перагаворы з Індыяй, Інданезіяй», — удакладніў ён.

Старшыня Калегіі ЕЭК праінфармаваў, што кіраўнікі дзяржаў разгледзелі асноўныя напрамкі міжнароднай дзейнасці ЕАЭС. «За мінулыя гады пазіцыі Еўразійскага эканамічнага саюза на міжнароднай арэне значна ўмацаваліся, — канстатаваў ён. — СНД, ШАС, АСЕАН і іншыя аб'яднанні з'яўляюцца нашымі партнёрамі. Закладваюцца базавыя нормы ўзаемадзеяння Саюза з БРІКС. Умацоўваецца сетка кантактаў з краінамі Лацінскай Амерыкі і Афрыкі».

Бакытжан Сагінтаеў падкрэсліў, што на пляцоўках ЕАЭС прасоўваецца ідэя развіцця шматбаковага дыялогу. «У частцы гандлёвай палітыкі краіны Саюза былі інфармаваны аб развіцці ў ЕАЭС маркіроўкі тавараў, — сказаў ён. — Гэта сістэма даказала сваю эфектыўнасць з пункту гледжання абароны ад кантрафактнай прадукцыі, павышэння падаткаў. Кіраўнікам дзяржаў былі прадстаўлены вынікі рэалізацыі Стратэгіі развіцця еўразійскай эканамічнай інтэграцыі да 2025 года. Рэалізацыя гэтага дакумента надала пэўны імпульс інтэграцыі па ўсіх ключавых кірунках. У сферы прамысловасці створаны механізм фінансавання сумесных кааперацыйных праектаў, першыя праекты ўжо адобраны. У аграпрамысловым комплексе зацверджаны агульныя падыходы да забеспячэння харчовай бяспекі. Створаны інфармацыйны рэсурс — Карта развіцця аграіндустрыі ў ЕАЭС, у яе ўключаны 357 праектаў на суму парадку 18 мільярдаў долараў ЗША. У сферы працоўнай міграцыі падпісана Пагадненне аб узаемным прызнанні дакументаў аб вучоных ступенях у дзяржавах ЕАЭС».

Таксама падпісана Пагадненне аб узаемным прызнанні банкаўскіх гарантый пры ажыццяўленні дзяржзакупак і Пагадненне аб адзінай сістэме мытнага транзіту ЕАЭС і трэцяга боку. Прыняты шэраг мер для развіцця эканамічнага супрацоўніцтва ў дзяржавах — членах ЕАЭС у сферы турызму.

## Даслоўна

# ЕАЭС ПЕРАХОДЗІЦЬ УСЕ НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ МЕЖЫ

На пасяджэнні ў пашыраным складзе Аляксандр Лукашэнка на правах старшыні адзначыў, што па дамоўленасці з кіраўнікамі дзяржаў — членаў ЕАЭС выступаць лідары не будуць. Сваё бачанне далейшага развіцця аб'яднання і вынікі сумеснай работы ў сваіх выступленнях агучылі кіраўнікі краін-назіральніц і прадстаўнікі замежных дэлегацый, якія таксама ўзялі ўдзел у саміце.



**Прэзідэнт Ірана Масуд Пезешкіян** асабіста прысутнічаць на саміце ў Мінску не змог па аб'ектыўных прычынах. Ён выступіў па відэасувязі. Аляксандр Лукашэнка пажадаў яму ўсялякіх поспехаў. «А народу Ірана, нашаму блізкаму народу — пераадолець усе праблемы, якія сёння паўсталі», — дадаў ён.

«Міжнародная супольнасць, у прыватнасці Савет Бяспекі ААН і МАГАТЭ, павінны больш адказна ставіцца да агрэсараў і падпальшчыкаў вайны. Я ўдзячны ўсім краінам, якія асудзілі гэту абуральную агрэсію, — сказаў Масуд Пезешкіян. — Саміт ЕАЭС дае выдатную магчымасць данесці да ўсяго свету калектыўную пазіцыю дзяржаў-членаў, якія рашуча асуджаюць гэту агрэсію і звязаныя з ёй глабальныя і рэгіянальныя пагрозы». Масуд Пезешкіян падзякаваў за рашэнне даць Ірану статус краіны-назіральніцы і выказаў упэўненасць, што ў гэтага інтэграцыйнага аб'яднання вялікая будучыня.

***



**Прэзідэнт Кубы Мігель Дыяс-Канель Бермудэс** у сваім выступленні адзначыў, што ў гэтым «варожым міжнародным кантэксце» пляцоўка Еўразійскага эканамічнага саюза набывае яшчэ большае значэнне. «ЕАЭС пераходзіць усе нацыянальныя межы і з'яўляецца пляцоўкай для дыялогу і супрацоўніцтва, што вельмі неабходна для стабільнасці, развіцця, росквіту і міру, — пераканаыны ён. — Кажучы пра мір на планеце, я выдатна разумею, што свет з'яўляецца ўстойлівым толькі тады, калі для гэтага ёсць універсальная воля».

***



**Прэзідэнт Узбекістана Шаўкат Мірзіёеў** заявіў, што пашырэнне і паглыбленне ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з краінамі ЕАЭС — адзін з прыярытэтаў знешнеэканамічнай палітыкі яго краіны: «За чатыры гады ўзаемадзеяння ў статусе дзяржавы-назіральніцы знешнегандлёвы абарот Узбекістана з краінамі саюза павялічыўся на 80 % па выніках мінулага года і склаў 18 мільярдаў долараў. Пашыраецца наменклатура гандлёвых аперацый, перш за ўсё за кошт паставак прамысловай прадукцыі. Колькасць сумесных прадпрыемстваў і праектаў вырасла ўтрая», — адзначыў ён.

***



**Наследны прынц Абу-Дабі, старшыня Выканаўчага савета Абу-Дабі Шэйх Халед бен Мухамед бен Заід аль-Нахаян** заявіў: «Мы нацэлены на ўмацаванне сувязяў з ЕАЭС і хацелі б вывесці супрацоўніцтва на новы ўзровень. Мы хацелі б дасягнуць узаемнага развіцця. Мы верым, што гандаль — гэта не толькі адзін са спосабаў дасягнення ўстойлівага развіцця, але і дасягнення міру і стабільнасці на міжнароднай арэне».

***



**Першы намеснік прэм'ер-міністра Манголіі Ням-Асарын Учрал** адзначыў: «Мы маем усе магчымасці для пашырэння супрацоўніцтва не толькі ў гандлі і транспарце, але і ў такіх галінах, як палітыка, зялёнае развіццё, лічбавая трансфармацыя, навука і адукацыя».

*На палях Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета Аляксандр Лукашэнка правёў двухбаковыя сустрэчы*

# ГАНДЛЁВА-ЭКАНАМІЧНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА — ДА ЎЗРОЎНЮ ПАЛІТЫЧНАГА

## Узаемны інтарэс Беларусі і ААЭ разнастайны

На сустрэчы з Наследным прынцам Абу-Дабі, старшынёй Выканаўчага савета шэйхам Халедам бен Мухамедам бен Заідам аль-Нахаянам Прэзідэнт Беларусі адзначыў, што ў высокага госця адносна насычаны дзень у нашай краіне. «І вельмі важны (я хацеў бы, каб гэта быў важны дзень у гісторыі вашай дзяржавы), — удакладніў беларускі лідар. — Мы з вамі падпішам пагадненне аб нашым будучым супрацоўніцтве. Я вельмі спадзяюся, што ўзровень нашага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва падцягнецца да ўзроўню палітычнага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Эміратамі».



Фота БелТА.

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы адзначыў: крыўдзіцца няма на што. «Мы нядрэнна супрацоўнічаем, — канстатаваў ён. — Сведчаннем гэтаму з'яўляюцца аб'екты, інвестыцыйнае супрацоўніцтва паміж намі. Вы ведаеце, што мы разам з эмірацкай кампаніяй будуем «Паўночны бераг».

Па словах Прэзідэнта, напярэдадні Наследны прынц Абу-Дабі ўпершыню прысутнічаў на Еўразійскім эканамічным форуме, які праходзіў у Мінскім міжнародным выставачным цэнтры. «Магутны будынак, цэлы комплекс, пабудаваны з вашай дапамогай, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Мы вам за гэта вельмі ўдзячныя».

Яшчэ адна будоўля, якая ажыццяўляецца ў беларускай сталіцы з удзелам эмірацкай кампаніі (як удакладніў кіраўнік дзяржавы, на сотні мільёнаў долараў), — узвядзенне гасцінічнага комплексу ў цэнтры сталіцы, у раёне вуліцы Янкі Купалы. Прэзідэнт выказаў упэўненасць, што аб'ект, які вельмі ўражвае, у найбліжэйшы час будзе завершаны, што яшчэ раз засведчыць супрацоўніцтва, сяброўства паміж Беларуссю і Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі.

«Ведаю, што Эміраты (у гэтых адносінах вы, вядома, малайцы) дапамагаюць вельмі многім дзяржавам, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — У вас створаны спецыяльны фонд дапамогі. За час яго існавання да гэтага года вы аказалі дапамогу ста дзяржавам на 98 мільярдаў долараў. Гэта ўражальныя аб'ёмы. Вы таксама супрацоўнічаеце з Сусветным банкам па аказанні дапамогі, інвеставалі праз яго фонды тры мільярды долараў. Хацеў бы папрасіць вас, каб не забыліся і пра нашы кампаніі. І калі ў рамках фонду (вы гэта практыкуеце) мы зможам пастаўляць сваю якасную прадукцыю, пачынаючы ад прадуктаў харчавання да машынабудаўнічай прадукцыі, калі вы нас будзеце прыцягваць да гэтай праграмы, мы вам будзем удзячныя».

У канцы сустрэчы беларускі лідар перадаў самыя добрыя пажаданні свайму даўняму сябру — Прэзідэнту ААЭ. «І скажыце яму, што мы яго ў любы час чакаем у Беларусі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

У сваю чаргу Наследны прынц Абу-Дабі адзначыў, што сустракацца з беларускім лідарам для яго — вялікі гонар. Ён перадаў Аляксандру Лукашэнку самыя цёплыя пажаданні ад Прэзідэнта Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў.

«Адносіны паміж Беларуссю і Эміратамі вельмі моцна развіваюцца, — падкрэсліў Халед бен Мухамед бен Заід аль-Нахаян. — Вы ведаеце, што за апошні год тавараабарот паміж краінамі павялічыўся на 800 %. Мы цэнім уклад Беларусі і ў форум, які вы праводзіце, і ўвогуле ў наша двухбаковае супрацоўніцтва».

Наследны прынц праінфармаваў, што інвестыцыі ААЭ ў Беларусь ужо перавысілі 4 мільярды долараў. «Намеры ўсяго кіраўніцтва Эміратаў — на 100 працэнтаў інвеставаць у Беларусь, — падкрэсліў ён. — Сумесна мы рэалізуем шмат інфраструктурных праектаў у Беларусі, і, вядома, самы вялікі і адметны з іх — «Паўночны бераг». Супрацоўнічаем у сферы харчовай бяспекі, устараняем бар'еры для гандлю сельскагаспадарчай прадукцыяй паміж нашымі краінамі. Што датычыцца тэхналогій, наша ўзаемадзеянне працягвае ўмацоўвацца, асабліва ў сферы штучнага інтэлекту, разумнай лагістыкі і лічбавай адукацыі».

* * *

*Дарэчы, учора бакамі было падпісана Міжурадавае пагадненне аб гандлі паслугамі і ажыццяўленні інвестыцый. Яго падпісалі намеснік Прэм'ер-міністра Беларусі Наталля Пяткевіч і дзяржаўны міністр па пытаннях знешняга гандлю Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў Тані бен Ахмед Аль Зейудзі. Беларусь стала першай дзяржавай — членам ЕАЭС, якая падпісала з ААЭ падобнае пагадненне.*

*Падрабязнасці на 6-й стар.*

# РЭЗЕРВЫ ДЛЯ СУПРАЦОЎНІЦТВА ЁСЦЬ

## Што абмяркоўвалі лідары Беларусі і М'янмы

Прэзідэнт Беларусі на палях саміту ЕАЭС правёў двухбаковую сустрэчу са Старшынёй Дзяржаўнага адміністрацыйнага савета, Прэм'ер-міністрам Рэспублікі Саюз М'янма Мін Аун Хлайнам. Гэта не першая сустрэча лідараў — у сакавіку кіраўнік урада М'янмы наведваў з афіцыйным візітам Беларусь. І, як нагадаў беларускі лідар, тады яны дасягнулі сур'ёзных дамоўленасцяў.

«Важнасць сённяшняй сустрэчы заключаецца ў тым, што мы праз некаторы час (невялікі адрэзак часу мінуў) можам абмеркаваць і ацаніць, наколькі правільнымі былі прынятыя рашэнні і што мы ўжо зрабілі на сёння», — адзначыў кіраўнік нашай краіны.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, у дзвюх дзяржаў назіраецца сур'ёзная ўзаемная цікавасць, і ён нагадаў, што ў сувязі з гэтым бакі дамовіліся выпрацаваць канкрэтны план сумесных дзеянняў, пэўную «дарожную карту», па якой Беларусь і М'янма будуць арганізоўваць сумесныя дзеянні ў найбліжэйшы час. «Мерапрыемствы гэтай «дарожнай карты», гэтага сумеснага плана будуць уключаць развіццё адносін не толькі ў галіне палітыкі, гуманітарных адносін і дыпламатыі, але і ў сферы гандлёва-эканамічных адносін», — падкрэсліў Прэзідэнт. Аб тым, што ўжо зроблена, лідараў праінфармаваў міністр замежных спраў Беларусі.

«Некаторыя кірункі нашых дамоўленасцяў мы ўжо пачынаем рэалізоўваць, вырашаем праблемы, нават ствараем сумесныя прадпрыемствы на вашай тэрыторыі. Мы адкрылі новы кірунак супрацоўніцтва. Я хачу вас запэўніць, што ў гэтым кірунку мы і будзем дзейнічаць», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

**На саміце працавалі Вераніка КАНЮТА, Валерыя СЦЯЦКО.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Слуцкий сыродельный комбинат» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже одним лотом **комплекса имущества (зданий, сооружений и оборудования) Узденского производственного участка ОАО «Слуцкий сыродельный комбинат»** в составе:

| № п/п | Наименование |
|---|---|
| | **Здания и сооружения** |
| 1 | Главный производственный корпус, пл. 3 592,8 кв. м, инв. № 623/С-1096 (составные части и принадлежности: теневой навес, пристройка – 4 шт., навес, забор) |
| 2 | Гаражи, пл. 614,6 кв. м, инв. № 623/С-1097 (составные части и принадлежности: пристройка – 3 шт.) |
| 3 | Здание котельной, пл. 332,2 кв. м, инв. № 623/С-1098 (составные части и принадлежности: пристройка – 2 шт.) |
| 4 | Здание для мойки мусорных контейнеров, пл. 14 кв. м, инв. № 623/С-60710 (составные части и принадлежности: площадка для мусора) |
| 5 | Проходная, пл. 20,2 кв. м, инв. № 623/С-60709 |
| 6 | Дезбарьер, инв. № 623/С60711 (составные части и принадлежности: площадка) |
| 7 | Градирня (инв. № 000006У), пл. 42 кв. м, инв. № 623/С-60941 |
| 8 | Водонапорная башня (инв. № 000004У), высота 21,15 м, пл. 10,6 кв. м, инв. № 623/С-60930 |
| 9 | Противопожарная емкость, пл. 44 кв. м, инв. № 623/С-60931 |
| 10 | Противопожарная емкость, пл. 30 кв. м, инв. № 623/С-60932 |
| 11 | Артскважина, инв. № 623/С-60951 (инвентарный номер 000011У) (составные части и принадлежности: павильон для пульта управления) |
| 12 | Артскважина, инв. № 623/С-60952 (инвентарный номер 000012У) (составные части и принадлежности: павильон для пульта управления) |
| 13 | Артскважина, инв. № 623/С-60953 (инвентарный номер 000013У) (составные части и принадлежности: павильон для пульта управления) |
| 14 | Линия ЛЭС, протяженность 793,3 м, инв. № 623/С-60940 |
| 15 | Площадные сети канализации, протяженность 515,9 м, инв. № 623/С-60939 |
| 16 | Площадные сети водопровода, протяженность 668,2 м, инв. № 623/С-60938 |
| | **Оборудование** |
| 17 | Котел паровой Е-1.0-09-ГЗ, 1992 г. в., заводской № 13051, рег. № 25-21-836, инв. № 000185У |
| 18 | Котел паровой с газовой горелкой:<br>- котел паровой стальной КП-4.0-0.9, 2012 г. в., зав. № 37, рег. № 25-21-0838;<br>- горелка газовая ГБГ-3.5-0.5, зав. № 180, инв. № 000456У |
| 19 | Система учета газа в комплекте, инв. № 000457У |
| 20 | Система водоподготовки в комплекте с автоматикой, инв. № 000455У |
| 21 | Подогреватель-теплообменник, размеры: 3,5*0,3 м, инв. № 000066У |
| 22 | Подогреватель-теплообменник, размеры: 3,5*0,3 м, инв. № 000067У |
| 23 | Горелка газовая блочная ГБ-0.85-0.1 (к котлу Е-1.0-09ГЗ), инв. № 000501У |
| 24 | Горелка газовая блочная ГБ-0.85-0.1 (к котлу Е-1.0-09ГЗ), инв. № 000502У |
| 25 | ГРУ котельной (газорегулирующая установка), инв. № 000271У |
| 26 | Резервуар для хранения молока из нержавеющей стали, двустенный, объем V=50 куб. м, инв. № 000375У |
| 27 | Резервуар для хранения молока из нержавеющей стали, одностенный, объем V=5 куб. м, инв. № 003424 |
| 28 | Резервуар РВ-5 из нержавеющей стали, одностенный объем V=5 куб. м, инв. № 991001245 |
| 29 | Точка доступа ISCO-802/11a: автоматическая система контроля и учета электроэнергии (АСКУЭ), инв. № 000485У |
| 30 | Весы платформенные электронные НПВ=5000 кг, с индикатором весоизмерительным Newton NT-200A, инв. № 000332У |
| 31 | Весы платформенные электронные НПВ=5000 кг с индикатором весоизмерительным CAS СИ-2001А, инв. № 000428У |
| 32 | Емкость для хранения молока: из нержавеющей стали, одностенная, объем V=5 куб. м, инв. № 000316У |
| 33 | Агрегат электронасосный ЭЦВ 6-6.5-120, инв. № 000019У |
| 34 | Резервуар Я1-ОСВ-4 (для хранения сливок): из нержавеющей стали, двустенный, объем V=4 куб. м, инв. № 000161У |
| 35 | Резервуар Я1-ОСВ-6 (для хранения сыворотки): из нержавеющей стали, двустенный, объем V=6 куб. м, инв. № 000265У |
| 36 | Резервуар Я1-ОСВ-6 (для хранения сыворотки): из нержавеющей стали, двустенный, объем V=6 куб. м, инв. № 000266У |

Объекты недвижимости **№№ 1–10, 15** расположены на земельном участке с кадастровым номером **625650100005000060** *(право постоянного пользования, площадь 2,0535 га)* по адресу: Минская обл., Узденский р-н, г. Узда, пер. Колхозный, 13. *Участок расположен в охранной зоне электрических сетей напряжением до 1000 вольт на площади 0,0521 га.*

Объект недвижимости **№ 11** расположен на земельном участке с кадастровым номером **625684200009000012** *(право аренды по 16.02.2073, площадь 0,1139 га)* по адресу: Минская обл., Узденский р-н, Узденский с/с, 21. *Земельный участок имеет ограничения в использовании в связи с расположением в зоне санитарной охраны источников питьевого водоснабжения на площади 0,1139 га).*

Объекты недвижимости **№№ 12, 13** расположены на земельном участке с кадастровым номером **625684200009000011** *(право аренды по 16.02.2073, площадь 0,4306 га)* по адресу: Минская обл., Узденский р-н, Узденский с/с, 20. *Земельный участок имеет ограничения в использовании в связи с расположением на природных территориях, подлежащих специальной охране (в зоне санитарной охраны источников питьевого водоснабжения) на площади 0,4306 га, в охранной зоне электрических сетей напряжением до 1000 вольт на площади 0,0320 га, в придорожной полосе (контролируемой зоне) автомобильной дороги на площади 0,4306 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) – **1 042 713,60 бел. руб**. Задаток 10 % от начальной цены – **104 271,00 бел. руб.). Стоимость снижена на 60 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 13.12.2023, 31.01.2024, 23.05.2024, 16.07.2024, 03.09.2024, 19.10.2024, 21.12.2024, 05.02.2025, 07.05.2025.

Аукцион состоится **23.07.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **21.07.2025** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320**. **Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, телефоны для осмотра: (8044) 738-42-04, (801718) 55-0-25.**

УНП 600119098

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ

Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП» 25 июля 2025 г. в 14.00 проводит повторные торги по продаже следующих объектов

| № п/п | Наименование объекта продажи | Основные технические и эксплуатационные характеристики | Начальная цена продажи снижена на 40 % и составляет с учетом НДС 20 %, белорусских рублей | Задаток, белорусских рублей |
|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | **Самолет АН-2** | Самолет сельскохозяйственный Ан-2 (заводской номер 1Г17804, бортовой номер EW62619) 1977 года выпуска | 30 888,00 (тридцать тысяч восемьсот восемьдесят восемь рублей 00 копеек) | 3 088,80 (три тысячи восемьдесят восемь рублей 80 копеек) |

**Собственник имущества:** открытое акционерное общество «Рассвет имени К. П. Орловского», 213944, Республика Беларусь, Могилевская область, Кировский р-н, аг. Мышковичи, ул. Орловского, 24, тел. +375223770601, тел. для осмотра объектов продажи +375223770615.

**Организатор торгов:** унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1.

**Место проведения торгов:** г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Лот № 1 продается без условий на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены, с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору торгов в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения торгов; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов (в двух экземплярах); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком. Задаток перечисляется на расчетный счет унитарного предприятия «Могилевское отделение БелТПП» р/с № BY88ALFA30122641790010270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Могилев, BIC: ALFABY2X, УНП 700016628; физическим лицам – предъявить паспорт; иные документы в соответствии с Положением о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в собственности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь, организуемых унитарным предприятием «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты».

Условия регистрации, участия в торгах размещены на интернет-сайте организатора по адресу: www.mogilev.cci.by.

**Срок заключения договора купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем)** – в течение 10 рабочих дней после проведения торгов.

Срок оплаты предметов торгов на условиях заключенного договора купли-продажи.

Торги состоятся 25 июля 2025 г. в 10.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112. Последний срок подачи заявления – 24 июля 2025 г. до 12.00.

Регистрация участников торгов 25 июля 2025 г. с 09.30 до 10.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Телефоны для справок: (0222) 778032, +375 44 735 00 30 – Жилина Ольга Александровна

**РУП «Институт недвижимости и оценки»** (Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «МИНСККОНТРАКТ»** (Продавец)

**Электронные торги состоятся 09.07.2025**

**Лот № 1:**

**ФОЛЬКСВАГЕН ТРАНСПОРТЕР,**

кузов, рама № WV2ZZZ70Z3X017379, 2002 г. в. Начальная цена с НДС 20 % – 14 670,00 руб. Задаток – 1 467,00 руб.

**Лот № 2:**

**ГАЗ 3309,**

кузов, рама № 33070080151785 X9633090080961477, 2008 г. в. Начальная цена с НДС 20 % – 8 100,00 руб. Задаток – 810,00 руб.

**Местонахождение лотов №№ 1–2:** Минский р-н, пос. Сухорукие, ул. Базовская, 1А.

**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 07.07.2025 в 16.00

**Организатор электронных торгов: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**


## Акцэнты



*Як паведамілі ў прэс-службе беларускага ўрада, учора адбылася тэлефонная размова Аляксандра Турчына з Міхаілам Мішусціным. Прэм'ер-міністры Беларусі і Расіі абмеркавалі шэраг канкрэтных пытанняў гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння, а таксама графік маючых адбыцца кантактаў. Бакі яшчэ раз падкрэслілі нацэленасць на аператыўнае вырашэнне ўсіх пытанняў у рамках Саюзнай дзяржавы і Еўразійскага эканамічнага саюза.*

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# ПРАДКАЗАЛЬНАСЦЬ І ПРАЗРЫСТАСЦЬ УМОЎ ДЗЕЙНАСЦІ

## Беларусь і ААЭ падпісалі пагадненне аб гандлі паслугамі і інвестыцыях

Міжурадавае пагадненне аб гандлі паслугамі і ажыццяўленні інвестыцый падпісалі ўчора ў Доме ўрада намеснік Прэм'ер-міністра Беларусі Наталля ПЯТКЕВІЧ і дзяржаўны міністр па пытаннях знешняга гандлю Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў Тані бен Ахмед Аль Зейудзі.



Чакаецца, што заключэнне міжнароднага дагавора прынясе істотную выгаду і ўмацуе двухбаковыя гандлёва-эканамічныя сувязі паміж краінамі.

Дарэчы, Беларусь стала першай дзяржавай — членам ЕАЭС, якая падпісала пагадненне па паслугах і інвестыцыях з ААЭ.

— Такое ўражанне, што нябёсы спрыяюць таму, каб нашым двухбаковым адносінам і пагадненням было дадзена зялёнае святло, — пракаментавала Наталля Пяткевіч.

Яна нагадала, што ў Беларусі прайшоў IV Еўразійскі эканамічны форум, на якім была панэль, прысвечаная ўзаемаадносінам з ААЭ:

— І вы ўдзельнічалі ў ёй. Графік наследнага прынца таксама супаў з форумам, і цырымонія перадачы нашых пагадненняў адбудзецца на самым высокім узроўні. Сёння (27 чэрвеня. — **«Зв.»**) мы падпісваем два найважнейшыя дакументы — і аб двухбаковым супрацоўніцтве, і аб супрацоўніцтве ў рамках ЕАЭС.

Віцэ-прэм'ер падкрэсліла выключную ролю дзяржаўнага міністра па пытаннях знешняга гандлю ў падрыхтоўцы пагаднення паміж ЕАЭС і ААЭ. Яна адзначыла і вельмі вялікую работу калег па падрыхтоўцы двухбаковага пагаднення.

Наталля Пяткевіч акцэнтавала ўвагу на тым, што падпісанне двухбаковага дакумента адкрывае ўваход для ААЭ ў пул краін, якім Беларусь дае найбольш спрыяльны міжнародны рэжым дзейнасці.

Таксама віцэ-прэм'ер высока ацаніла поспехі ААЭ ў эканамічным развіцці.

— Нам дастаўляе глыбокую радасць і задавальненне такое інтэнсіўнае развіццё ўзаемаадносін з вашай краінай, — падзялілася яна.

У сваю чаргу Тані бен Ахмед Аль Зейудзі падзякаваў беларускаму боку за сяброўства і гасціннасць. Ён адзначыў, што за апошнія два месяцы гэта ўжо яго другі візіт у Беларусь:

— Гэта сведчанне таго, што кіраўніцтва нашай краіны ставіцца з асаблівай цікавасцю да вашай дзяржавы. І ў найбліжэйшыя месяцы мы плануем арганізаваць яшчэ адзін візіт эканамічнай дэлегацыі ў вашу краіну.

Дзяржаўны міністр па пытаннях знешняга гандлю ААЭ адзначыў, што Беларусь для яго дзяржавы — дружалюбная краіна, стратэгічны партнёр, з якім ёсць магчымасці для развіцця супрацоўніцтва ў эканамічнай, гандлёвай і інвестыцыйнай сферах.

— Мы бачым, што развіваецца як двухбаковы тавараабарот, так і інвестыцыйнае супрацоўніцтва. Гэтаму спрыяюць прамыя авіязносіны, — выказаў упэўненасць ён. — З эмірацкага боку ёсць інвестыцыі ў беларускую інфраструктуру, мы ўдзельнічаем у эканамічных форумах Беларусі.

Дзяржаўны міністр дадаў, што за апошні тыдзень былі праведзены перагаворы з беларускімі бізнесменамі па пытанні развіцця інвестыцый у прамысловым сектары.

У Міністэрстве эканомікі пракаментавалі падпісанне пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў аб гандлі паслугамі і ажыццяўленні інвестыцый.

У ведамстве расказалі, што перагаворы па паслужна-інвестыцыйным пагадненні доўжыліся крыху больш за два гады ў фармаце «fast-track».

— Дакумент прадугледжвае стварэнне прававога поля для рэгулявання двухбаковага гандлю паслугамі, а таксама змяшчае дадатковыя механізмы развіцця інвестыцыйнага супрацоўніцтва. Беларусь і ААЭ фіксуюць умовы, на якіх кампаніі могуць ажыццяўляць дзейнасць у сферы паслуг. Таксама замацоўваюцца ўмовы знаходжання асобных катэгорый фізічных асоб, уцягнутых у гандаль паслугамі, — паведамілі ў Мінэканомікі.

